І.У. Рошчына (Мінск, Мінскі абласны
інстытут развіцця адукацыі)

# ПРАБЛЕМЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ: МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТ

Згодна з азначэннем, якое дадзена ў «Палажэнні аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання», «*цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта форма ўступных іспытаў, арганізаваная на аснове педагагічных тэстаў, стандартызаваных працэдур правядзеня тэставага кантролю, апрацоўкі, аналізу і прадстаўлення вынікаў, якая выкарыстоўваецца для правядзення конкурсу пры паступленні ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі»* [4].

Вось ужо дзесяць гадоў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў на чале з шаноўным М.С. Фяськовым імкнецца даказаць настаўнікам, вучням і іх бацькам, шырокай грамадскасці, што ўсе праблемы з атрыманнем нізкіх балаў на ЦТ звязаны выключна з недапрацоўкамі настаўнікаў і вучняў, што тэсты цалкам адпавядаюць школьнай праграме, што такая разнастайнасць у формах выпускных і ўступных экзаменаў — толькі на карысць вучням [5, 6].

На самой справе спектр праблем, звязаных з падрыхтоўкай да тэсціравання, значна шырэйшы, аднак у педагагічнай прэсе ён да сённяшняга дня цалкам не акрэслены.

Мы паспрабуем вызначыць ключавыя праблемы, звязаныя з падрыхтоўкай да цэнтралізаванага тэсціравання, і некаторыя шляхі іх вырашэння.

**Першая праблема** — гэта адсутнасць методыкі работы з тэстамі як сістэмы канкрэтных прыёмаў, спосабаў, тэхнік педагагічнай дзейнасці ў асобных адукацыйных працэсах [2].

На самой справе, праблема гэтая значна глыбейшая, чым здаецца на першы погляд. У сістэме работы настаўніка мовы праграмай прадмета прадугледжваецца правядзенне навучальных дыктантаў, пераказаў і сачыненняў, якія абавязкова праводзяцца ў класе. Іх мэта — падрыхтаваць дзяцей да авалодання спецыяльнымі ўменнямі і навыкамі, якія потым будуць правярацца пры правядзенні адпаведнай кантрольнай работы (дыктанта, пераказа, сачынення).

У дачыненні да тэста, па-першае, не распрацавана методыка падрыхтоўкі да дадзенага віду работы, па-другое, адсутнічае прапісаны ў праграме час на правядзенне навучальнага тэста. На думку настаўнікаў, мэтазгодна было б у 5 ці 6 класе адвесці 1–2 гадзіны на такі від работы, як навучальны тэст, каб растлумачыць дзецям асноўныя асаблівасці тэсціравання і даць першасныя навыкі работы з тэстамі. Сёння ж упершыню ў школьным курсе мовы тэст з’яўляецца адразу як від кантрольнай работы ў 8 класе.

Чым небяспечны такі падыход? Па-першае, для настаўніка такая форма кантролю, як тэст, не з’яўляецца абавязковай: хачу — правяду, не хачу — ніхто і слова не скажа. Па-другое, настаўніку і вучням элементарна афіцыйна не пакідаюць ніводнай гадзіны для таго, каб навучыць рабоце з тэстам: параўнаць тэст з іншымі відамі кантролю, вызначыць яго асаблівасці, пашукаць шляхі рашэння тэставых заданняў, выпрацаваць прыёмы работы з тэстамі. Па-трэцяе, калі няма такога віду дзенасці ў афіцыйнай методыцы выкладання мовы, ніхто не рыхтуе самога настаўніка для работы з тэстамі. Пры гэтым «вага» тэставага бала пры паступленні ў навучальныя ўстановы значна перавышае «вагу» балаў за дыктанты і пераказы, атрыманыя ў школе

**Другая праблема.** Для паспяховага выканання тэста па мове патрэбны ў большасці сваёй зусім іншыя ўменні і навыкі, чым пры напісанні дыктантаў, пераказаў. Калі гэтыя звыклыя віды дзейнасці арыентаваны на чытанне, слуханне, перадачу ў вуснай ці пісьмовай форме прачытанага ці ўспрынятага на слых тэксту, стварэнне тэксту на аснове дадзенага, самастойнае звязнае выказванне сваіх думак, пачуццяў, разважанняў, меркаванняў на пэўную тэму, [3]. то работа з тэстам амаль не патрабуе гэтых навыкаў (толькі ў частцы Б, дзе трэба запісаць без памылак знойдзены адказ). Тут запатрабаваны зусім іншыя прыемы і метады работы: аналіз, сінтэз, уменне вылучаць ключавыя пазіцыі, адсякаць лішняе, параўноўваць і рабіць высновы, супастаўляць і інш. Гэтым прыёмам складана навучыцца самастойна. Настаўнік на ўроку не мае дастатковых магчымасцяў для выпрацоўкі ўсіх вышэйназваных навыкаў. Пры гэтым М.С. Фяськоў, гаворачы пра падрыхтоўку да ЦТ, падкрэслівае: «Толькі выкананне патрабаванняў вучэбных праграм па змесце прадметаў і захаванне традыцыйных методык выкладання, апрабаваных нацыянальнай школай, можа прывесці да станоўчых вынікаў у навучальным працэсе» [7].

**Праблема трэцяя** вядомая ўсім настаўнікам і вучням. Звязана яна з асаблівасцямі школьных падручнікаў. Бясспрэчна, падручнікі адпавядаюць адукацыйным стандартам па прадмеце, створаны на прынцыпе навуковасці, матэрыял у іх выкладзены паслядоўна, прадстаўлена дастатковая колькасць практыкаванняў розных тыпаў. Аднак пры гэтым не заўсёды ў поўнай меры выкарыстоўваюцца магчымасці табліц, схем, апор, іншых прыёмаў, якія здольны ператварыць кожнае правіла ў стройную, лагічную сістэму.

**Яшчэ адна праблема.** Колькасць гадзін на вывучэнне мовы ў 10–11 класах невялікая, яны адводзяцца на паглыбленне ведаў вучняў па ўсіх раздзелах мовазнаўства, таму на падрыхтоўку да тэсціравання час не прадугледжаны. Гэтай мэце адпавядаюць факультатыўныя заняткі, аднак наведванне іх з’яўляецца добраахвотным і неабавязковым. З другога боку, у настаўніка з’яўляецца магчымасць працаваць з больш матываванымі вучнямі.

Разгледзім далей тыя спосабы, формы і метады арганізацыі работы, якія, на нашу думку, даюць станоўчыя вынікі пры падрыхтоўцы да ЦТ.

Па-першае, трэба ўсвядоміць той факт, што без спецыяльна арганізаванай работы па падрыхтоўцы менавіта да тэсціравання дасягнуць

поспеху будзе надзвычай складана. Схема арганізацыі работы па падрыхтоўцы да ЦТ можа мець наступную структуру:

**Правесці ўваходны кантроль:**

- вызначыць актуальны ўзровень ведаў вучняў з дапамогай дыягнастычнага тэсціравання, пры неабходнасці — анкетавання;
- адзначыць яўныя прабелы, у ідэале — сфарміраваць індывідуальную адукацыйную траекторыю па падрыхтоўцы да ЦТ кожнага вучня.

**Арганізаваць работу па паўтарэнні моўнага матэрыялу з улікам наступных акалічнасцей:**

- Работу па паўтарэнні і паглыбленні ведаў арганізаваць такім чынам, каб спачатку паўтарыць тэарэтычны матэрыял, пры гэтым засяродзіўшы ўвагу вучняў на тых нюансах правіл, якія выходзяць за межы школьнага курса, з'яўляюцца заўвагамі да правіл альбо выклікаюць пытанні.Пры гэтым паўтарэнне неабходна арганізоўваць на аснове поўнага структуравання матэрыялу. Гэта могуць быць як гатовыя табліцы, схемы [1, 8, 9], так і схемы, складзеныя настаўнікам або самім вучнем.
- Спачатку адпрацаваць матэрыял па тых тэмах, па якіх ёсць яўныя прабелы ў ведах.
- Матэрыял можна паўтараць не паслядоўна, а па асобных тэмах, уразброс (маючы на ўвазе, што ўвесь тэарэтычны матэрыял у той ці іншай ступені засвоены вучнямі).
- Не разглядаць на адных занятках дзве блізкія тэмы (напрыклад, канчаткі назоўнікаў розных скланенняў).
- З мэтай эканоміі часу разглядаць на адных занятках адно пытанне з арфаграфіі ці марфалогіі і адно па сінтаксісу ці пунктуацыі.
- Трэніровачныя заданні прапаноўваць «па гарызанталі» (па адной і той жа тэме з усіх тэстаў). Прычым добры эфект прыносіць наступны прыём: пасля паўтарэння тэмы вучань выконвае практычныя заданні з пяці першых тэстаў, правярае, карэкціруе свае веды, выконвае наступныя пяць заданняў.
- Трэніровачныя тэсты «па вертыкалі» (поўнасцю) выконваюцца спачатку не часцей чым адзін раз у месяц.
- Толькі калі паўторана большасць тэм, выконваць поўныя тэсты часцей.
- Адпрацоўваць тэмы з улікам фармулёвак заданняў па дадзенай тэме ў тэстах. Гэта надзвычай важна, бо часта вучні памыляюцца не таму, што не ведаюць правіл, а таму, што не разумеюць, аб чым іх пытаюць. Задача настаўніка — навучыць бачыць знаёмае правіла нават у самай складанай фармулёўцы.
- Вучыць вылучаць ключавыя паняцці ў заданнях, адсякаць «лішнюю» інфармацыю, адсякаць яўна памылковыя варыянты адказаў.
- Абавязкова правесці 3–4 заняткі з запаўненнем бланкаў тэставых заданняў, навучыць запаўняць бланк, растлумачыць і паказаць правілы адмены памылковых адказаў. Есць падставы гаварыць, што пэўную частку

балаў вучні заўсёды страчваюць з-за недахопаў у запаўненні бланкаў адказаў, хаця статыстыку па гэтым параметры мець немагчыма.

- Праводзіць прафілактыку стрэсавых станаў у вучняў, растлумачваючы асблівасці стварэння, будовы тэстаў і працэсу арганізацыі тэсціравання. Неабходна пазнаёміць вучняў з «Палажэннем аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання» [4], а таксама з меркаваннямі РІКВ адносна школьнага і тэставага бала [6]. Калі вучань будзе ўсведамляць, што існуюць пэўныя методыкі складання тэстаў, накіраваныя на стварэнне сітуацыі «не поспеху», ён будзе больш спакойна і асэнсавана падыходзіць да асабістых вынікаў тэсціравання.

**Выхадны кантроль:**

- Правесці ў некалькі этапаў (мінімум 2–3) з наступнай карэкцыяй прабелаў у ведах. На апошнім этапе падрыхтоўкі да ЦТ работа можа быць арганізавана толькі індывідуальна, бо ў кожнага з вучняў будуць свае прабелы ў ведах, свае затрудненні.
- Абавязкова нацэліць вучняў наведаць трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання. Мэта гэтага этапу — быць гатовымі да змен у фармулёўках заданняў, якія абавязкова прысутнічаюць у тэстах трэцяга этапа.

За апошнія гады цэнтралізаванае тэсціраванне і тэсціраванне як форма праверкі ведаў, уменняў і навыкаў вучняў трывала ўвайшлі ў навучальную практыку. Аднак, як паказвае наш аналіз, падрыхтоўка да тэсціравання як метадычная праблема яшчэ патрабуе свайго глыбокага навуковага асэнсавння, вывучэння і фарміравання як сістэмы метадаў і прыёмаў, якія будуць эфектыўна працаваць на карысць усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу.

ЛИТЕРАТУРА

1. Беларуская мова ў табліцах і схемах: вучэбны дапаможнік для вучняў старэйшых класаў сярэдняй школы. — Мінск, 1999.

2. Коджаспирова, Г.М. Словарь по педагогике. — М.; Ростов н/Д., 2005.

3. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей, якія забяспечваюць атрыманне выш. Адукацыі / пад рэд. М.Г. Яленскага. — Мінск, 2007.

4. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 06.06.2006 N 714 (ред. от 23.07.2010) «Об утверждении Положения о порядке организации и проведения централизованного тестирования».

5. Феськов, Н.С. О некоторых проблемах тестовых форм оценки знаний / Веснік адукацыі. — 2008. — № 6. — С. 3–8.

6. Фяськоў, М.С. Тэсты — форма кантролю, а не навучання / Веснік адукацыі. — 2009. — № 5. — С. 3–11.

7. Фяськоў, М.С. Чаму абітурыенты з году ў год робяць адны і тыя ж памылкі? Адказ можа даць статыстыка / Настаўніцкая газета. — 2010. — 20 сакавіка.

8. Цыбульская, С.І. Школьны курс беларускай мовы ў табліцах і тэстах: падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену. У 2 ч. Ч І. — Мінск, 2008. — (Дамашні настаўнік).

9. Цыбульская, С.І. Школьны курс беларускай мовы ў табліцах і тэстах: падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену. У 2 ч. Ч II. — Мінск, 2008. — (Дамашні настаўнік).